# ВІЗУАЛЬНАЯ РЭПРЭЗЕНТАЦЫЯ РОДУ ЗАВІШАЎ У МУЗЕЙНЫХ ФОНДАХ МІНСКА І КОЎНА

**К. А. Любая**

*Беларускі дзяржаўны універсітэт, г. Мінск;*
*liubayaksenia@gmail.com;*
*навук. кір. – В. С. Макарэвіч, канд. гіст. навук, дац.*

Мэта дадзенага артыкула – стварыць агульную карціну стану рэпрэзентатыўнай партрэтнай галерэі Завішаў: разгледзець сувязь паміж партрэтамі розных прадстаўнікоў сям'і, паспрабаваць прасачыць лёс карцін, разгледзець верагодныя прычыны іх падзеленасці паміж фондамі Літвы і Беларусі.

***Ключавыя словы:*** візуальная рэпрэзентацыя; Завішы; сармацкі партрэт; беларускія шляхецкія роды.

Рэпрэзентацыя рода ці самапрэзентацыя асобы з'яўлялася важнай часткай шляхецкай культуры. Ад статуса ў грамадстве залежыла шмат: магчымасць выбару шлюбнай стратэгіі, дасягненне высокіх пасадаў, магчымасць крупных зямельных дамоваў. Праз партрэт шляхціч мог паказаць свой статус, радавод, кар'ерныя дасягненні і, нават, паспрабаваць выявіць свае далейшыя планы на жыццё. У залежнасці ад эпохі, у якой жыў галоўны герой твору, залежыў жанр партрэта, а таксама яго элементы. Так, напрыклад сармацкі ў форме параднага шляхецкага партрэта, а потым і труменнага, замацаваўся ў выяўленчым мастацтве Вялікага Княства Літоўскага ў XVI–XVIII стагоддзі. На сармацкім партрэце шляхціч адлюстроўваўся ў парадным ці вайсковым адзенні, навокал дадаваліся рэчы, характэрныя для яго прафесійнага занятку. Фон часцяком быў монахромны, каб не перашкаджаў гледачу разглядаць сэнсавыя элементы партрэта. Таксама, для прасцейшага чытання выявы маглі дадавацца гербы і падпартрэтныя надпісы-легенды.

Напрацягу некалькіх стагоддзяў росквіту сармацкага партрэта, ён стаўся неабходнай рэччу для прадстаўнікоў буйнейшых беларускіх шляхецкіх і магнацкіх родаў, сярод якіх вылучаюцца Сапегі, Радзівілы і Агінскія. Персанальныя партрэты складаліся ў галерэі, якія ў сваю чаргу захоўваліся ў тытульных і найбуйнейшых родавых маёнтках. Такім чынам уладальнікі такіх галерэяў маглі падрабязна распавесці пра гісторыю свайго роду гасцям, падкрэсліць статус сям'і і ўнёсак яе асобных прадстаўнікоў.

Мода на стварэнне персанальных партрэтаў не абышла і даўні беларускі шляхецкі род Завішаў. За амаль пяць стагоддзяў сваёй дзейнасці, Завішы прымалі актыўны ўдзел у палітычным, эканамічным

і культурным жыцці беларускіх зямель. Прадстаўнікі роду займалі высокія пасады ў адміністрацыйным і ваенным апараце ў часы Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай і, нават, Расійскай імперыі. Таксама яны з'яўляліся крупнымі землеўладальнікамі, змяняючы і перамяшчаючы свае зямельныя ўладанні па ўсёй тэрыторыі Беларусі.

Па колькасці, а таксама стылістычнай аднароднасці вядомых нам партрэтаў Завішаў, мы можам сцвярджаць аб існаванні ў пэўны час адзінай партрэтнай галерэі Завішаў. На ролю маёнтку, які б іх захоўваў можна ў роўнай ступені прапанаваць Бакшты Мінскага ваяводства і Дварэц Слонімскага павета Наваградскага ваяводства. Менавіта гэтыя тэрыторыі сталі цэнтрам «збірання» Завішамі зямель на Міншчыне і Слонімшчыне.

Таксама з імі звязаны важны статусны паказнік. У справавых перапісках, а таксама афіцыйных дакументах Завішы часцяком узгадваюцца ў якасці «графаў на Бакштах і Дварцы» [4]. Атрымаўшы гэтыя надзелы ў пасаг ад роду Кезгайлаў, Завішы з 1556 года па 1678 гадоў вялі амаль неперарыўныя зямельныя спрэчкі з Шэметамі і Агінскімі [7]. Замацваць статус сваёй «перамогі» вырашыў Ігнацы Кшыштафавіч Завіша, які афіцыйна тытулаваўся ў якасці графа на Бакштах, Бярдычаве і Завішыне [3]. Напрыканцы XIX стагоддзя «цэнтрам» асноўнай галіны Завішаў стаў маёнтак Кухцічы Ігуменскага павета. Такім чынам лёс партрэтнага збору Завішаў будзе цесна звязаны з гісторыяй апошніх прадстаўніц роду – Марыі Евы Янаўны Завішы (за мужам Радзівіл) і Марыі Магдалены Янаўны Завішы (за першым мужам – Красінскай і за другім – Радзівіл) [2].

Пасля смерці бацькі менавіта Магдалена атрымала ў спадчыну асноўную частку спадчыны Завішаў, а тасама палац у Варшаве. Яе першы муж – граф Людвіг Юзаф Красінскі быў аматарам антыкварыяту і мастацтва і меў досыць вялікую калекцыю. Магдалена атрымала ў спадчыну не толькі землі, але і радавы збор партрэтаў. Аднак, нажаль, падзеі першай чвэрці XX стагоддзя вымусілі графіню эміграваць і на некалькі дзесяцігоддзяў лёс партрэтнага збору стаецца даволі цмяны. Магчыма, часткова яны трапілі ў зборы Радзівілаў. [5].

Таксама мы ведаем, што частка партрэтаў трапіла ў рукі адзінай дачкі Магдалены – Людавіке Красінскай, якая у будучым выйдзе замуж за Адама Людвіка Чартарыйскага. У спадчыну яна атрымала частку мацярынскага маёнтку, а таксама мастацкія калекцыі сваіх бацькоў, якія ў выніку сама передала музею Чартарыйскіх у Кракаве. [6].Дарэчы, у экспазіцыі музею Чартарыйскіх знаходзіцца і адзіны вядомы нам дзіцячы партрэт Завішаў партрэт чатырохгадовага старасціча старадубскага Казіміра Завішы (1750–?).

Такім чынам рэпрэзентатыўная галерэя Завішаў засталася падзеленай паміж чатырма музеямі ў трох розных краінах Еўропы. Пры гэтым, вядомая частка знаходзіцца ў фондах Нацыянальнага гістарычнага, Нацыянальнага мастацкага музеяў Беларусі, а таксама ў Нацыянльным мастацкім музеі Літвы імя Чурлёніса. Пры гэтым карціны, якія захоўваюць беларускія музеі за рэдкім выключэннем датычацца асобаў з XVII стагодзя. Партрэты маюць падобныя рысы і намаляваныя ў адной стылістыцы. Таму, хутчэй за ўсё, яны былі намаляваныя і замоўленыя ў адзін перыяд. Магчыма, выкананы нават адным і тым жа аўтарам. Прывалюе мужчынскі партрэт.

Выключным з'яўляецца партрэт Барбары Радзівіл з Завішаў (1690–1770), які на дадзены момант знаходзіцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі. Партрэт афармлены ў выглядзе медальёна. Пры гэтым існуе падпартрэтны надпіс. Барбара была даволі актыўным палітычным дзеячам, і нават удзельнічала ў канфедэрацыі супраць Станіслава Ляшчынскага. [1] Падобны па стылі партрэт – яе мужа Мікалая Фаўстына Радзівіла (1688–1746), які захаваўся ў Нясвіскай партрэтнай галерэі Радзівілаў. Хутчэй за ўсё яны рабіліся разам і адным майстрам.

Калекцыя ў музеі імя Чурлёніса ў Коўне з'яўляецца меньш аднароднай. Партрэты, прадстаўленыя ў ёй былі намаляваныя з вялікім храналагічным прамежкам і актрамя ўсяго маюць зусім розны стыль. Самай цікавай з карцін прадстаўленых у фондзе музея партрэт Аляксандры Завішы з Агінскіх (сярэдзіна XVI стагоддзе). Вельмі ажурны і лёккі, ён спалучае ў сабе элементы сармацкага партрэту і партрэту еўрапейскага класіцызму. Ён зусім не падобны да партрэта яе мужа, пісара вялікага літоўскага Андрэя Завішы (1614–1678), выканага ў класічнай для завішанскай традыцыі. Пры гэтым ён таксама не падобны на партрэты роду Агінскіх. Таму такое аўтарскае вырашэнне хутчэй за ўсё было проста навеяна модай.

Такім чынам, партрэтная галерэя Завішаў даволі неаднародная. Партрэты ствараліся ў розныя часы, рознымі аўтарамі, пад уплывам тагачасных тэндэнцыяў. Пры гэтым праз амаль усе партрэты прасочваецца агульная рыса: імкненне да спрошчанага класічнага сармацкага партрэта. Прывалююць мужскія партрэты. Існуюць таксама жаночыя і дзіцячыя, але яны адрозніваюцца і сэнсава і стылістычна, з'яўляюцца хутчэй неабходным дадаткам, чым асноўным сродкам рэпрэзентацыі сям'і.

На дадзены момант галоўнымі месцамі захоўвання партрэтаў з рэпрэзентатыўнай галерэі Завішаў з'яўляюцца Нацыянальны гістарычны і Нацыянальны мастацкі музеі Беларусі ў Мінску, а таксама Нацыянальны мастацкі музей Літвы імя Чурлёніса ў Коўне. А таксама

адзінкавыя партрэты захаваныя і ў іншых зборах, напрыклад Чартарыйскіх у Кракаве.

Лёс партрэтаў даволі цмяны. Хутчэй за ўсё партрэтны збор фармаваўся на базе тытульных маёнткаў, да якіх у розныя часы мы можам аднесці Бакшты і Кухцічы Ігуменскага павету і Дварэц Слонімскага. На пачатку ХХ стагоддзя, дзякуючы шлюбам і дзейнасці апошніх прадстаўніц галоўнай веткі Завішаў – Марыі Евы і Марыі Магдалены, збор трапіў у рукі Красінскіх, Чартарыйскіх і Радзівілаў, у калекцыях якіх праіснаваў да нашых дзён.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. *Мацук А.* Радзівіл Барбара / А. Мацук // Вялікае Княства Літоўскае: Энцыклапедыя ў 3 т. – Мінск: БелЭн, 2010. – Т. 3. – С. 384.
2. *Надсан, А*. Выбранае / А. Надсан. – Мінск: Кнігазбор, 2014. – 604 с.
3. *Насевіч, В.* Завішы / В. Насевіч // Вялікае Княства Літоўскае: Энцыклапедыя ў 2 т. – Мінск: БелЭн, 2007. – Т. 1. – Вып. 2. – С. 638–639.
4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Ф. 694. – Воп. 5. – Архіў Радзівілаў, князёў.
5. *Хурсік, В.* Успаміны Магдаліны Завішынай (Красінскай, Радзівіл) / В. Хурсік // Асветніца і мецэнатка: да 150-годдзя Магдалены з Завішаў Радзівіл : матэрыялы круглага стала (Мінск, 15 снежня 2011 года) / [укладанне, прадмова і навуковае рэдагаванне І. Багдановіч]. – Мінск, 2013. – С. 76–78.
6. *Kmoch, M.* W. Maria Ludwika Joanna Józefa z Krasińskich Czartoryska (1883–1958) i jej działalność w regionie / M. W. Kmoch // Krasnosielcki Zeszyt Historyczny. – №10 (38–41). – 2019. – S. 102–107.
7. Pamietniki Krzysztofa Zawiszy wojewowdy Minskiego, 1666–1721 / wydane z oryginalnego rekopismu i opatrzone przypiskami przez Juliana Bartoszewicza. – Warszawa: Naklad J. Zawiszy, 1862 // Электронны рэсурс: https://www.wbc.poznan.pl/dlibra/show content/publication/edition/7409?id=7409&dir ids=1 – Дата доступа: 17.05.2022.